партыйна-дзяржаўнай і гаспадарчай эліты. Ад імя народа і па даручэнню партыйнага правадыра яна распараджалася дзяржаўнай уласнасцю, у тым ліку і жыццём людзей. Наменклатура была ўсемагутная, ад яе залежала, якое месца зойме чалавек у сацыяльнай структуры, у дзяржаўнай сістэме размеркавання. Яна бесакантрольна распараджалася грамадскім багаццем, якое было назапашана дзесяткамі мільёнаў грамадзян. Партыйна-дзяржаўны наменклатурны чыноўнік не меў нічога, акрамя месца ў наменклатуры. Страта гэтага месца азначала ператварэнне яго ў звычайнага чалавека. Таму наменклатура так жорстка і пільна сачыла за захаваннем правілаў гульні ў таталітарнай сістэме: яна заставалася ўсемагутнай, пакуль захоўваўся ўстаноўлены рэгламент. Чыста наменклатурнае кіраванне ў СССР праіснавала палову стагоддзя – да канца 1980-х гг.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. Аренд, Х. Истоки тоталитаризма / Х. Аренд. М., 1996.
2. Божанов, В.А. Восхождение к абсолютной власти. Большевики и советское государство в 20-е годы / В.А. Божанов. Минск, 2004.
3. Брук-Шеверд, Г. Судьба советских перебежчиков / Г. Брук-Шеверд. Нью-Йорк; Иерусалим; Париж, 1983.
4. Бутенко, А.П. Партия – государство как тандем особого способа существования и изменения власти / А.П. Бутенко // Социально-гуманитарные знания. 2000. № 3.
5. Восленский, М. Номенклатура. Господствующий класс Советского Союза / М. Восленский. М., 1991.
6. XIII съезд РКП(б). Май 1924: стенографический отчет. М., 1963.
7. КПСС в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК. Т. 2. 1917 – 1922. М., 1983.
8. Семенникова, Л.И. Россия в мировом сообществе цивилизаций / Л.И. Семенникова. Брянск, 1999.
9. Сперанский, М.М. Проекты и записки / М.М. Сперанский. М.; Л., 1961.
10. Сталин, И.В. Сочинения / И.В. Сталин. Т. 5.

---

***А.Ф. Вішнеўскі**, прафесар кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь, доктар гістарычных навук, прафесар права;*

***М.Ф. Ганчарэнка**, дацэнт кафедры аператыўна-вышуковай дзейнасці Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь, кандыдат юрыдычных навук*

# ОРГАНЫ ДЗЯРЖАЎНАЙ БЯСПЕКІ Ў МЕХАНІЗМЕ ЎМАЦАВАННЯ САВЕЦКАГА ПАЛІТЫКА-ПРАВАВОГА РЭЖЫМУ (20-я – пачатак 30-Х гг. ХХ ст.)

*Аналіз нарматыўных прававых актаў дазваляе сцвярджаць, што з моманту свайго ўтварэння савецкія органы дзяржаўнай бяспекі атрымалі юрыдычную магчымасць пашыраць свае функцыянальныя абавязкі. З сярэдзіны 20-х гг. пазасудовыя паўнамоцтвы былі пакладзены ў аснову дзейнасці Аб'яднанага дзяржаўнага палітычнага ўпраўлення. Асабліва ўзмацнілася іх прымяненне ў канцы 20-х – пачатку 30-х гг., калі партыя бальшавікоў прыступіла да ліквідацыі так званага кулака як класа. Па сутнасці, праваахоўныя органы сталі інструментам станаўлення і ўмацавання аўтарытарнага рэжыму і перарастання яго ў таталітарны палітыка-прававы рэжым.*

З першых дзен існавання савецкая ўлада зарэкамендавала сябе як цвёрдая і бескампрамісная сіла, якая мае намер выкарыстоўваць для захавання рэвалюцыйных заваёў любыя сродкі, ў тым ліку і самыя жорсткія. Менавіта ад бальшавіцкіх кіраўнікоў зыходзілі ўказанні аб прымяненні рашучых мер да тых, хто перашкаджаў ажыццяўленню рэвалюцыйных мерапрыемстваў. Таму ўжо 7 (20) снежня 1917 г. Саветам народных камісараў (СНК) было прынята рашэнне аб утварэнні сіл дзяржаўнай бяспекі – Усерасійскай надзвычайнай камісіі па барацьбе з контррэвалюцыяй і сабатажам (УНК).

Факты сведчаць, што УНК стваралася ў абставінах сакрэтнасці. У прыватнасці, тэкст пастановы СНК ад 7 (20) снежня не быў апублікаваны, а ў «Известиях ЦИК» ад 10 снежня 1917 г. з'явілася толькі кароткае паведамленне, што Саўнаркам утварыў УНК па барацьбе з контррэвалюцыяй і сабатажам і ўказваўся адрас яе размяшчэння ў Петраградзе. Нават у «Зборы ўзаканенняў і распараджэнняў РСФСР» за 1917–1918 гг. пра УНК не ўпамінаецца. Упершыню няпоўны тэкст пастановы СНК ад 7 (20) снежня 1917 г. быў надрукаваны ў 1920 г., а больш поўны – у 1926 г. Арыгінальная (сапраўдная) версія гэтага дакумента з'явілася ў друку толькі ў 1958 г. – у гады хрушчоўскай адлігі [4, с. 79]. Таму можна пагадзіцца з вядомым амерыканскім даследчыкам Р. Пайпсам, які сцвярджае: «Тое, што ў момант утварэння НК не былі перададзены галоснасці яе функцыі і паўнамоцтвы, мела

сапраўды жахлівыя наступствы, гэта дало ёй магчымасць прэтэндаваць на такія прывілеі, якія зусім не прадугледжваліся спачатку» [8, с. 492].

Згодна пастановы СНК ад 7(20) снежня 1917 г. асноўнымі задачамі УНК былі наступныя: «1) спыняць і ліквідаваць усе контррэвалюцыйныя і сабатажныя спробы і дзеянні па ўсёй Расіі, з боку каго б яны ні зыходзілі; 2) выдача суду рэвалюцыйнага трыбунала ўсіх сабатажнікаў і контррэвалюцыянераў і выпрацоўка мер барацьбы з імі; 3) камісія вядзе толькі папярэдняе следства, паколькі гэта патрэбна для спынення… камісія падзяляецца на аддзелы: інфармацыйны, арганізацыйны і непасрэдна баявы.

Меры – канфіскацыя, выдварэнне, пазбаўленне картачак, апублікаванне спісаў ворагаў народа і г. д.» [4, с. 79]. Як бачым, на УНК ускладалася задача раскрыцця, дазнання, папярэдняга следства і спынення злачынстваў супраць дзяржавы. Разам з тым юрыдычны аналіз пастановы СНК ад 7 (20) снежня 1917 г. дазваляе сцвярджаць, што заканадаўцам не зафіксаваны з вычарпальнай паўнатою ўсе правы супрацоўнікаў НК. Змест прававой нормы (п. 3) быў сфармуляваны так, што правапрымяніцель (органы УНК) меў магчымасць пашырана тлумачыць свае паўнамоцтвы і, як следства, парушаць законнасць, правы і свабоды грамадзян.

УНК, дзякуючы пашырэнню сваіх функцыянальных абавязкаў, у канцы грамадзянскай вайны стала самым уплывовым узброеным органам савецкай дзяржавы.

З увядзеннем нэпа меркаваліся сур'ёзныя змены ў карнай палітыцы дзяржавы, формах і метадах працы спецслужб. Невыпадкова яшчэ ў студзені 1921 г. Ф. Дзяржынскі акцэнтаваў увагу НК на змяненнях метадаў яе работы. «Усіх падазроных, – гаварыў ён, – неабходна трымаць на ўліку, высветліць, праверыць… Гэта гіганцкая інфармацыйная работа павінна выступіць на першы план. Грубыя прыкметы, падзел на свайго ці не на свайго па класавай прыкмеце – кулак, былы афіцэр, дваранін і інш. – можна было прымяняць, калі Савецкая ўлада была слабаю» [4, с. 418–419].

Згодна з рашэннем IX Усерасійскага з'езда Саветаў аб рэарганізацыі УНК 6 лютага 1922 г. Усерасійскі цэнтральны выканаўчы камітэт (УЦВК) прыняў пастанову ліквідаваць Надзвычайную камісію і яе мясцовыя органы. Для правядзення ў жыццё задач, якія раней выконвала УНК, пры НКУС РСФСР было ўтворана Дзяржаўнае палітычнае ўпраўленне (ДПУ), старшынёй якога стаў народны камісар унутраных спраў Ф. Дзяржынскі. У гэты ж дзень УЦВК зацвердзіў Палажэнне аб Дзяржаўным палітычным упраўленні. Функцыі ДПУ былі накіраваны на папярэджанне і падаўленне адкрытых контррэвалюцыйных выступленняў, барацьбу са шпіянажам, бандытызмам, выкрыццё контррэвалюцыйных арганізацый і інш. [3, с. 251].

Такім чынам, УЦВК надаў органам дзяржбяспекі правы органаў дазнання і папярэдняга следства. Яны мелі права арышту, вобыску, выемкі, маглі карыстацца ў аператыўна-службовай дзейнасці галоснымі і негалоснымі сродкамі і метадамі, праводзіць вышуковыя і іншыя аператыўныя мерапрыемствы (агентурнае назіранне за злачынцамі ці падазронымі асобамі, групамі, арганізацыямі і г. д.), праглядаць унутраную і замежную паштова-тэлеграфную і іншую карэспандэнцыю, даваць дазвол на выезд за мяжу і ўезд у краіну, высылаць з краіны палітычна ненадзейных замежных грамадзян, патрабаваць ад кіраўнікоў арганізацый і ўстаноў, прадпрыемстваў розныя даведкі, выпіскі і г. д. [9, с. 124–125].

Рэформа органаў дзяржбяспекі 1922 г. праследавала мэту адмяніць пазасудовыя паўнамоцтвы УНК і яны былі адменены. Узмацніўся нагляд і кантроль за іх працай з боку органаў Савецкай улады і перш за ўсё юстыцыі. На жаль, гэта цягнулася нядоўга. Ужо 9 сакавіка 1922 г. Палітбюро ЦК РКП(б) разглядае пытанне аб прадастаўленні ДПУ права непасрэднай расправы ў адносінах да асоб, якія ўдзельнічалі ва ўзброеных рабаваннях, крымінальнікаў-рэцэдывістаў, злоўленых на месцы злачынства. ДПУ надаваліся правы ссылкі ў Архангельск і заключэння ў архангельскі канцлагер «падпольшчыкаў», анархістаў і левых эсэраў, крымінальнікаў-рэцыдывістаў.

Праз месяц пазасудовыя паўнамоцтвы ДПУ яшчэ больш пашырыліся. Так, 27 красавіка 1922 г. Палітбюро ЦК РКП(б) разгледзела пытанне аб наданні ДПУ права непасрэдных расстрэлаў тых бандытаў, якія будуць захоплены на месцы злачынства. Гэтае рашэнне Палітбюро, як і папярэднія, было зацверджана УЦВК у якасці нарматыўнага прававога акта [6, с. 41]. Летам і восенню 1922 г. заканадаўца (УЦВК) пайшоў па шляху яшчэ большага пашырэння паўнамоцтваў ДПУ. Дэкрэт УЦВК ад 10 жніўня 1922 г. надаў ДПУ права адміністрацыйнай высылкі асоб, якія мелі дачыненне да контррэвалюцыйных злачынстваў, тэрмінам да трох гадоў уключна. Разгляд гэтых спраў ускладаўся на Асобую камісію пры НКУС пад старшынствам наркама і прадстаўнікоў ад НКУС і НКЮ, якія зацвярджаліся УЦВК. На перыяд адміністрацыйнай высылкі асобы пазбаўляліся актыўнага і пасіўнага выбарчага права [2, с. 135].

Супрацоўнікі ДПУ у сваёй аператыўна-службовай дзейнасці, перш за ўсе ў галіне барацьбы з дзяржаўнымі злачынствамі, абавязаны былі кіравацца прынятымі ў 1922 г. Крымінальным і Кры-

мінальна-працэсуальным кодэксамі. Заканадаўца ў лік дзяржаўных злачынстваў уключыў контррэвалюцыйныя злачынствы (шпіянаж, сабатаж, кантрабанда) і ўсе злачынствы супраць парадку кіравання (знявага прадстаўніка ўлады, падробка дакументаў і інш.). Спецыяльных артыкулаў, якія рэгулявалі работу органаў дзяржаўнай бяспекі у кодэксах не было. Таму заканадаўца (УЦВК) палічыў неабходным спецыяльнымі (сакрэтнымі) пастановамі рэгуляваць іх аператыўна-службовую дзейнасць. Так, 16 кастрычніка 1922 г. УЦВК прыняў пастанову аб узмацненні барацьбы з бандытызмам. У адпаведнасці з прынятым нарматыўным прававым актам у мэтах хутчэйшага выкаранення бандыцкіх налётаў і ўзброеных рабаванняў органам ДПУ надавалася права пазасудовай расправы аж да расстрэлу ў адносінах асоб, якія былі затрыманы на месцы злачынства. Названым дакументам абмяжоўваліся функцыі пракурорскага нагляду за дазнаннем і следствам па палітычных справах, а таксама па абвінавачанню ў шпіянажы (арт. 55–73 і 213 Крымінальнага кодэкса).

УЦВК пайшоў па шляху пашырэння кола асоб, у адносінах да якіх узмацнялася карная палітыка. Так, у першай частцы другога артыкула пастановы сказана: «У дапаўненне і развіццё пастановы УЦВК аб парадку высылкі асоб, якія прызнаны сацыяльна-небяспечнымі (дэкрэт УЦВК ад 10 жніўня 1922 г. – *Аўт.*), прадаставіць утваранай згодна дэкрэту аб высылцы камісіі пры НКУС права высылаць і заключаць у лагер прымусовай працы на месцы высылкі на той жа тэрмін (не больш за 3 гады):

а) дзеячаў антысавецкіх палітычных партый (арт. 60, 61, 62 Крымінальнага кодэкса);

б) асоб, якія двойчы судзімыя за злачынствы, што прадугледжаны арт. 76, 85, 93, 140, 170, 171, 176, 180, 182, 184, 189, 190, 191 і 220 Крымінальнага кодэкса» [11, с. 136–138].

Такім чынам, калі ў дэкрэце УЦВК ад 10 жніўня 1922 г. аб адміністрацыйнай высылцы гаворка ішла пра асобы, які мелі дачыненне да контррэвалюцыйных злачынстваў, то ў пастанове ад 16 кастрычніка 1922 г. высылцы падлягалі асобы, якія прызнаваліся сацыяльна-небяспечнымі, перш за ўсё дзеячы антысавецкіх палітычных партый (анархісты, эсэры). Больш таго, пастанова надавала права органам ДПУ не толькі высылаць, але і заключаць у лагер прымусовай працы на месцы высылкі сацыяльна-небяспечных асоб.

Абмежаванне права пракурорскага нагляду за дазнаннем і следствам па палітычных справах, аб шпіянажы, а таксама па справах аб службовых злачынствах супрацоўнікаў дзяржбяспекі садзейнічала рэальнаму парушэнню органамі ДПУ крымінальна-працэсуальных норм, законнасці, што пазней, у канцы 1920–1930-х гг. ярка пра сябе заявіла.

Пасля ўтварэння СССР (30 снежня 1922 г.) пастановай Цэнтральнага выканаўчага камітэта (ЦВК) Саюза ССР 15 лістапада 1923 г. было ўтворана Аб’яднанае дзяржаўнае палітычнае ўпраўленне пры СНК СССР і зацверджана Палажэнне аб ім і яго органах на месцах. Старшынёй АДПУ быў прызначаны Ф. Дзяржынскі [10, с. 140–141]. Згодна з Палажэннем аб АДПУ СССР і яго органах на месцах для кіраўніцтва работай службы дзяржбяспекі ствараўся інстытут паўнамоцных прадстаўнікоў АДПУ пры СНК саюзных рэспублік. Функцыі нагляду за законнасцю дзеянняў АДПУ ускладваліся на Пракурора Вярхоўнага суда Саюза ССР. Прававое становішча органаў АДПУ было замацавана ў артыкулах 61–63 Канстытуцыі СССР 1924 г. [14, с. 298, 299]. Згодна з пастановай ад 15 лістапада 1923 г. органы АДПУ на пасяджэннях Калегіі АДПУ мелі права разглядаць справы аб дыверсіях, выбухах, порчы машынных установак, а таксама па іншых відах шкодніцтва з прымяненнем усіх мер рэпрэсій. Такім чынам, з органа калектыўнага разгляду найбольш складаных пытанняў аператыўна-службовай дзейнасці Калегія АДПУ фактычнаператваралася ў пазасудовы орган.

28 сакавіка 1924 г. Прэзідыум СССР зацвердзіў Палажэнне аб правах АДПУ ў частцы адміністрацыйных высылак, ссылак і заключэння ў канцэнтрацыйныя лагеры. Гэтым нарматыўным актам ён прадаставіў АДПУ права ў адносінах асоб, якія прызнаны органамі дзяржбяспекі сацыяльна небяспечнымі:

«а) высылаць такіх з мясцовасцей, дзе яны пражываюць, з забаронай далейшага пражывання ў гэтых мясцовасцях на тэрмін не больш за 3 гады;

б) высылаць з абавязковым пражываннем у вызначаных мясцовасцях па спецыяльнаму ўказанню АДПУ і абавязковым у гэтых выпадках галосным наглядам мясцовага аддзела ДПУ на той жа тэрмін;

в) заключаць у канцэнтрацыйны лагер тэрмінам да трох гадоў;

г) высылаць за межы Саюза ССР на той жа тэрмін» [6, с. 41].

Вынясенне пастановы аб высылцы ўскладалася на ствараемую Асобую нараду, якая фарміравалася старшынёй АДПУ з трох членаў Калегіі АДПУ. Вынясенне пастаноў аб высылцы ўскладаліся і на асобыя нарады, якія ствараліся з членаў Калегій ДПУ саюзных рэспублік пад старшынствам паўнамоцных прадстаўнікоў АДПУ СССР.

Асобыя нарады саюзных рэспублік мелі права высылкі ў межах тэрыторыі дадзенай рэспублікі ў адносінах да тых асоб, якія падазраваліся ў бандыцкіх налётах, грабяжах і разбоях, і калі не было дас-

татковых дадзеных аб накіраванні іх спраў у судовыя органы [6]. Пастанова Асобай нарады ДПУ саюзнай рэспублікі аб высылцы за яе межы і заключэнні ў канцалгеры ўступала ў сілу пасля яе зацвярджэння Асобай нарадай АДПУ СССР.

Такім чынам, калі першым органам пазасудовай расправы, згодна з пастановай ЦВК СССР ад 15 лістапада 1923 г., стала Калегія АДПУ, то другім пазасудовым органам з'явілася Асобая нарада пры АДПУ, створаная пастановай ЦВК СССР 28 сакавіка 1924 г. для ажыццяўлення адміністрацыйных высылак, ссылак і заключэння ў канцэнтрацыйныя лагеры. Пачатак стварэння органаў пазасудовай расправы ў маштабе СССР, як бачым, быў пакладзены ўжо ў першыя гады існавання новага дзяржаўна-палітычнага ўтварэння – Саюза ССР.

Многія нарматыўныя прававыя акты, якія тычыліся арганізацыі і дзейнасці АДПУ, прымаліся пад уплывам яго старшыні – Ф. Дзяржынскага. Гісторыя сведчыць, што менавіта ён садзейнічаў пашырэнню пазасудовых функцый АДПУ. Напрыклад, 29 студзеня 1924 г. Ф. Дзяржынскі напісаў пісьмо ў Палітбюро ЦК РКП(б), у якім прапанаваў для барацьбы з бандытызмам падпарадкаваць у аператыўных адносінах міліцыю і крымінальны вышук органам дзяржаўнай бяспекі, а таксама дазволіць апошнім пазасудовы разгляд спраў усіх удзельнікаў бандыцкіх фарміраванняў. Цікава, што прапановы Ф. Дзяржынскага сустрэлі ў той час рашучую нязгоду з боку некаторых наркамаў урада. «Далейшае пашырэнне правоў АДПУ на пазасудовы разгляд спраў калегія НКЗС лічыла б небяспечным», пісаў наркам замежных спраў Г. Чычэрын. Тым не менш Палітбюро ЦК РКП(б) і Прэзідыум ЦВК Саюза ССР 9 мая 1924 г. прынялі прапанову старшыні АДПУ Ф. Дзяржынскага. Органы АДПУ па дамоўленасці з мясцовымі ўладамі атрымалі права пазасудовай расправы ў адносінах удзельнікаў і саўдзельнікаў бандыцкіх фарміраванняў не толькі ў форме высылкі з дадзенай мясцовасці, заключэння ў канцэнтрацыйныя лагеры тэрмінам да трох гадоў, але і прымяненні да іх вышэйшай меры пакарання – расстрэлу [12, с. 143]. У сувязі з гэтым нельга не пагадзіцца з вядомым даследчыкам органаў савецкай міліцыі і дзяржаўнай бяспекі прафесарам В. Някрасавым, які піша: «Палітбюро і Прэзідыум ЦВК задаволілі просьбу Ф. Дзяржынскага таму, што рашучае слова было ўжо за Сталінам і за яго ўстаноўкамі» [7].

Далейшая гісторыя дзейнасці органаў АДПУ развівалася па шляху прадастаўлення ім новых пазасудовых паўнамоцтваў. Напрыклад, 4 лістапада 1925 г. Прэзідыум ЦВК СССР у мэтах барацьбы са злачыннымі здзелкамі на прадметы шырокага ўжытку і спекуляцыі імі дазволіў органам дзяржбяспекі прымяняць адміністрацыйную высылку асоб, якія займаліся такой дзейнасцю або ў ёй падазраваліся. 3 мая 1926 г. Прэзідыум ЦВК СССР даў паўнамоцтвы (тэрмінам на шэсць месяцаў) Асобай нарадзе пры АДПУ на высылку, ссылку і заключэнне ў лагер да 3 гадоў асоб, якія былі выкрыты ў кантрабанднай дзейнасці. У адносінах да кантрабандыстаў, якія аказвалі ўзброенае супраціўленне супрацоўнікам памежнай аховы, оранам АДПУ прадастаўляліся права пазасудовй расправы, уключаючы расстрэл. Але на гэта патрабавалася спецыяльная пастанова ЦВК СССР [5, с. 28, 29].

Да замежных грамадзян у пазасудовым парадку магла быць прыменена толькі высылка за межы СССР.

Сакрэтная пастанова Прэзідыума ЦВК Саюза ССР ад 4 красавіка 1927 г. давала права АДПУ разглядаць у пазасудовым парадку, аж да прымянення вышэйшай меры пакарання, справы па дыверсіям, падпалам, псаванню машынных установак як са злым намерам, так і без яго. 9 чэрвеня 1927 г. Прэзідыум ЦВК прадаставіў АДПУ права разгляду ў пазасудовым парадку спраў у адносінах да белагвардзейцаў, шпіёнаў і бандытаў, уключаючы прымяненне да іх вышэйшай меры пакарання – расстрэлу [5, с. 29].

Асабліва шырока пазасудовыя рэпрэсіі пачалі выкарыстоўвацца з канца 1929 г. пачатку 1930 г. Так, 23 верасня 1929 г. АДПУ прапанавала ўзмацніць прымяненне рэпрэсіўных мер па высылцы заможных сялян (так званых кулакоў), якія ўхіляліся ад выканання заданняў па хлебанарыхтоўках, і спекулянтаў збожжам. Справы, якія патрабавалі неадкладных рэпрэсій, па дамоўленасці з партыйнымі органамі маглі разглядацца ў пазасудовым парадку. Прычым паўнамоцныя прадстаўніцтвы АДПУ па дамоўленасці з партыйнымі інстанцыямі маглі самастойна выносіць меру пакарання.

Асаблівая роля ў пазасудовым разглядзе спраў у перыяд калектывізацыі ўскладалася на так званыя «тройкі». У публіцыстычных выданнях, гістарычнай і юрыдычнай літаратуры нярэдка можна сустрэць меркаванне, што менавіта толькі ў перыяд ліквідацыі кулака як класа былі створаны «тройкі», якія займаліся рэпрэсіямі ў пазасудовым парадку. Між тым у органах дзяржбяспекі «тройкі» былі ўзноўлены ў 1923 г., а праз шэсць год (1929 г.) у сладзе АДПУ функцыяніравала ўжо восем «троек».

У рэгіёнах для пазасудовай расправы над працаўнікамі Савецкай улады рашэннем Прэзідыума ЦВК СССР ад 9 чэрвеня 1927 г. стваpаліся мясцовыя «тройкі». Усе іх прыгаворы пасылаліся на зацвярджэнне ў Калегію АДПУ. Згодна з загадам АДПУ ад 2 лютага 1930 г. № 44/21, у мэтах «арганi-

заванага правядзення ліквідацыі кулака як класа» справы на арыштаваных «кулацка-белагвардзейскіх контррэвалюцыйных элементаў (першая катэгорыя)… заканчваюцца следствам у тэрміновым парадку і разглядаюцца тройкамі пазасудовым разглядам спраў, якія будуць утвораны пры ПП (паўнамоцныя прадстаўнікі. – *Аўт.*) АДПУ. Асноўная колькасць такіх арыштаваных заключаецца ў канцлагеры; у адносінах найбольш злоснага і махровага актыву к.-р. арганізацый і груповак і адзіночак – павінны прымяняцца рашучыя меры пакарання нават да ВМП» [1, с. 39, 40].

Па ініцыятыве абкамаў партыі стварэнне «троек» асабліва актывізавалася ў рэгіёнах усеагульнай калектывізацыі ў канцы 1929 г. Паводле слоў І.М. Варэйкіса, першага сакратара абкама УКП(б) Цэнтральна-Чарназёмнай вобласці, ў раёнах усеагульнай калектывізацыі без усялякіх на тое юрыдычных падстаў стваралі «тройкі», у якія ўваходзілі першыя сакратары райкамаў партыі, старшыні райвыканкамаў і начальнікі мясцовых органаў ДПУ [6, с. 43].

Цікава адзначыць, што ў канцы 1920-х – пачатку 1930-х гг. органы ўлады і кіравання СССР настолькі прывыклі да паняцця «тройка», што не толькі тэрмін, але і яго змест выкарыстоўвалі ў паўсядзённым кіраўніцтве так званымі кулацкімі пасяленнямі ў месцах высылкі. Напрыклад, сакрэтная інструкцыя ЦВК і СНК СССР ад 4 лютага 1930 г. «Аб мерапрыемствах па высяленні і раскулачванні кулакоў, канфіскацыі іх маёмасці» абавязвала наступнае: «акружнымі выканаўчымі камітэтамі павінны быць указаны месцы рассялення з тым, каб пасяленні ў адведзеных мясцовасцях дазваляліся толькі невялікімі пасёлкамі, упраўленне якімі ажыццяўляюцца спецыяльнымі камітэтамі (тройкамі)…» [1, с. 41–43]. У 1933 г. былі арганізаваны працоўныя пасёлкі АДПУ. Для адбору і накіравання зняволеных і членаў іх сямей у гэтыя пасёлкі пры паўнамоцных прадстаўніцтвах АДПУ былі таксама ўтвораны «тройкі» ў складзе прадстаўніка АДПУ, пракуратуры і краявога альбо абласнога суда.

У многіх публікацыях можна сустрэць меркаванне, што праз сістэму «троек» праходзілі справы толькі тых людзей, якіх абвінавачвалі ў палітычных злачынствах. Гэта не зусім так. 5 снежня 1931 г. загадам АДПУ № 736 на начальнікаў упраўленняў і аддзелаў АДПУ была ўскладзена задача аб забеспячэнні разгляду «тройкамі» крымінальных спраў, якія паступалі з мясцовых органаў дзяржбяспекі, у дзесяцідзённы тэрмін.

У мэтах лепшага ўліку насельніцтва ў краіне пастановай ЦВК і СНК СССР ад 27 снежня 1932 г. уводзілася адзіная пашпартная сістэма. Прапіску неабходна было завяршыць на працягу 1933 г., «ахапіўшы ў першую чаргу жыхароў Масквы, Ленінграда, Кіева, Мінска, Уладзівастока…» [1, с. 45, 46].

Ажыццяўленне пашпартызацыі насельніцтва і прапіскі пашпартоў ускладалася на савецкую рабоча-сялянскую міліцыю (РСМ). Органы міліцыі павінны былі прымяняць меры пазасудовых рэпрэсій ў адносінах да асоб, «якія адмовіліся добраахвотна выехаць з мясцовасці, у якой ім пражыванне забаронена ў сувязі з адмовай ў выдачы пашпарта, і якія вярнуліся… ў мясцовасць, у якой ім было забаронена пражыванне (рэжымная тэрыторыя)» [6, с. 44]. Для гэтай мэты пры паўнамоцных прадстаўніцтвах АДПУ былі арганізаваны спецыяльныя «тройкі» ў складзе памочніка паўнамоцнага прадстаўніка (старшыня) і двух членаў – начальніка пашпартнага аддзела і начальніка аператыўнага аддзела. За дзейнасцю «тройкі» прадугледжваўся пракурорскі нагляд. Як правіла, «тройка» разглядала справы ў адносінах да парушальнікаў пашпартнага рэжыму згодна спісаў, якія прадастаўлялі ўпраўленні (аддзелы, аддзяленні) рабоча-сялянскай міліцыі.

Можа ўзнікнуць пытанне, чаму вышэйназваныя «тройкі», якія разглядалі пытанні пашпартнага рэжыму, падпарадкоўваліся органам дзяржбяспекі. Справа ў тым, што 27 снежня 1932 г. ЦВК і СНК СССР прынялі пастанову аб утварэнні Галоўнага ўпраўлення РСМ пры АДПУ СССР і зацвердзілі палажэнне аб ім [13]. Тым самым кіраванне міліцыяй было выключана з непасрэднага распараджэння саўнаркамаў саюзных і аўтаномных рэспублік і перададзена АДПУ СССР і яго рэспубліканскім і мясцовым органам. Ускладанне функцый аховы грамадскага парадку на органы АДПУ сведчыла пра далейшае пашырэнне іх паўнамоцтваў. Начальнік Галоўнага ўпраўлення міліцыі пры АДПУ станавіўся адным з намеснікаў старшыні АДПУ. З падначаленнем міліцыі АДПУ, як сведчыць практыка, ішло паслабленне сувязі паміж органамі аховы грамадскага парадку і барацьбы з крымінальнымі злачынствамі і органамі ўлады як у цэнтры, так і на месцах. Міліцыя станавілася састаўной часткай рэпрэсіўнага механізму краіны.

На наш погляд, прынятцце ЦВК і СНК СССР пастановы ад 15 снежня 1930 г. «Аб ліквідацыі народных камісарыятаў унутраных спраў саюзных і аўтаномных рэспублік» сведчыла, што суверэнітэт і паўнамоцтвы вышэйшых органаў улады саюзных і аўтаномных рэспублік у галіне аховы грамадскага парадку і барацьбы з крымінальнай злачыннасцю на сваіх тэрыторыях у значнай ступені ўшчамляліся. «Ліквідацыю… наркаматаў унутраных спраў саюзных і аўтаномных рэспублік, на наш погляд, нельга прызнаць правамоцнай, бо яны раней былі ўтвораны вышэйшымі органамі дзяржаўнай улады

гэтых рэспублік, г. зн. цэнтральнымі выканаўчымі камітэтамі ці іх прэзідыумамі», – робіць выснову В. Каровін [5, с. 35].

Можна канстатаваць, што дзейнасць органаў АДПУ пайшла не па шляху выканання імі канстытуцыйных норм, захавання законнасці, а наадварот, іх парушэння і проста зневажання. Апошняе не павінна нас здзіўляць. Справа ў тым, што ў канцы 1920-х гг. вышэйшыя органы дзяржаўнай улады і кіравання СССР адышлі ад практыкі перыядычнага разгляду і абмеркавання пытанняў дзейнасці службы бяспекі. З'езды саветаў, сесіі ЦВК і пасяджэнні СНК СССР спецыяльна ні разу не абмяркоўвалі работу АДПУ і яго органаў на месцах. У парушэнне Канстытуцыі СССР іх функцыі цалкам перайшлі да Палітбюро ЦК УКП(б) і асабіста да І. Сталіна. Нагляд Пракурора Вярхоўнага Суда СССР у межах яго кампетэнцыі за дзейнасцю спецслужбаў на практыцы не ажыццяўляўся. Шэраг ведамасных нарматыўных актаў (загады, інструкцыі і інш.) супярэчылі заканадаўству, парушалі правы і свабоды грамадзян. Таму можа быць прыкладам загад АДПУ ад 19 студзеня 1930 г. № 25/13 «Аб недахопах у кіраўніцтве масавай інфармацыйна-асведамляльнай сеткай». З самой назвы загаду бачна, што ў органах АДПУ была створана сетка інфарматараў і асведамляльнікаў, пад негалосным наглядам якіх знаходзілася фактычна ўсё насельніцтва краіны (г. зн. існаваў палітычны вышук). У загадзе, у прыватнасці, гаварылася: «для асвятлення батрацкіх, бядняцкіх і серадняцкіх пластоў вёскі і рабочай масы вербаваць сексотаў (асведам.) толькі абсалютна праверaных…». У цыркулярным пісьме АДПУ ад 19 студзеня 1930 г. № 20/СОУ «Аб агентуры» даваўся крытычны аналіз працы сакрэтных агентаў, якія былі завербаваны на падставе кампраметуючых матэрыялаў, з ліку прадстаўнікоў былых эксплуататарскіх класаў. Гэтая катэгорыя агентуры асвятляла настрой сераднякоў, беднякоў, рабочых, выяўляла недахопы ў працы дзяржаўных органаў і грамадскіх арганізацый. Зразумела, што агенты, як адзначалася ў пісьме, дэзінфармавалі органы АДПУ ў адносінах да канкрэтных асоб, савецкіх устаноў і арганізацый, рабілі даносы на сумленных грамадзян [5, с. 34]. Менавіта на гэтай глебе фабрыкаваліся справы ў адносінах да савецкіх грамадзян, у тым ліку прадстаўнікоў творчай і тэхнічнай інтэлігенцыі, ваеннаслужачых і г. д.

Такім чынам, з самага пачатку свайго ўтварэння савецкія органы дзяржаўнай бяспекі атрымалі права пазасудовага разгляду спраў пра контррэвалюцыйныя злачынствы, буйныя спекуляцыі, дыскрэдытацыю Савецкай улады, кантрабанду, бандытызм, нежаданне падтрымліваць палітыку калектывізацыі, парушэнне пашпартнага рэжыму і г. д. Пачынаючы з сярэдзіны 1920-х гг. пазасудовыя паўнамоцтвы былі пакладзены ў аснову дзейнасці АДПУ. Асабліва шырока яны пачалі прымяняцца з канца 1920-х – пачатку 1930-х гг., калі Савецкая ўлада прыступіла да ліквідацыі так званага кулака як класа. Да гэтага перыяду (1920-я гг.) адносяцца і падаўленне апазіцыйных УКП(б) партый і ўдзел органаў бяспекі ў ліквідацыі так званых шкодніцкіх гнёздаў у народнай гаспадарцы.

Наданне органам дзяржаўнай бяспекі і органам аховы грамадскага парадку ў барацьбе з крымінальнай злачыннасцю пазасудовых паўнамоцтваў сведчыла, што іх дзейнасць у гэты перыяд была антыдэмакратычная. У дэмакратычнай дзяржаве не магло адно і тое ж ведамства весці следства па справе, выносіць па ёй рашэнне і прыводзіць вынесены прыгавор у выкананне. Калегія і Асобая нарада АДПУ свае пазасудовыя паўнамоцтвы працягвалі ажыццяўляць да ўтварэння НКУС СССР (ліпень 1934 г.).

Узмацненне карнай палітыкі савецкай дзяржавы, увядзенне расстрэла за здзяйсненне шэрагу дзяржаўных злачынстваў, аб'ектыўнага «вменения» ў адносінах сваякоў асуджаных за нязздзейсненае злачынства, пашырэнне сферы дзейнасці органаў АДПУ, ажыццяўленне ў краіне палітычнага вышуку, органаў пазасудовай расправы, масавай агентурна-асведамляльнай сеткі – усё гэта сведчыла пра слабасць грамадска-палітычнай сістэмы краіны, паніжэнне яе аўтарытэту сярод розных слаёў насельніцтва, асабліва інтэлігенцыі.

Па сутнасці, у разглядаемы перыяд праваахоўныя органы сталі паслухмяным інструментам у справе станаўлення і падтрымкі аўтарытарнага рэжыму і перарастання яго ў канцы 1920-х – пачатку 1930-х гг. у таталітарны палітыка-прававы рэжым.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. Без грифа «Секретно» / авт.-сост. И.Н. Кузнецов. Минск, 1997.

2. Декрет ВЦИК об администативной высылке от 10 августа 1922 г. // Коровин В.В. История отечественных органов безопасности. М., 1998.

3. Дзержинский Феликс Эдмундович. Биография. 2-е изд. М., 1983.

4. Из истории Всероссийской Чрезвычайной Комиссии. 1917–1921 гг. : сб. док. М., 1958.

5. Коровин, В.В. История отечественных органов безопасности / В.В. Коровин. М., 1998.

6. Мазохин, О.Б. Вся страна – концлагерь (правовое регулирование внесудебных полномочий ГПУ – ОГПУ) / О.Б. Мазохин // Закон и право. 1999. № 10.

7. Некрасов, В.Ф. Десять железных наркомов: уроки истории / В.Ф. Некрасов // Комсомольская правда. 1989. 29 сент.
8. Пайпс, Р. Русская революция : в 2 ч. / Р. Пайпс. М., 1994. Ч. II.
9. Положение о Государственном политическом управлении от 6 февраля 1922 г. / В.В. Коровин // История отечественных органов безопасности. М., 1998.
10. Положение об объединенном государственном политическом управлении СССР и его органах от 15 ноября 1923 г. // Там же.
11. Постановление ВЦИК от 16 октября 1922 г. // Там же.
12. Постановление Президиума ВЦИК СССР от 9 мая 1924 г. // Там же.
13. СЗ СССР. 1932. № 84. Ст. 518–519.
14. Съезды Советов в постановлениях и резолюциях. М., 1935.

---

***В.А. Данилов**, доцент кафедры теории и истории государства и права Академии МВД Республики Беларусь, кандидат исторических наук, доцент*

# ОРГАНИЗАЦИОННО-АНАЛИТИЧЕСКАЯ ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ БЕЛОРУССКОЙ МИЛИЦИИ ПО ПРОФИЛАКТИКЕ И ПРЕДОТВРАЩЕНИЮ ДЕТСКОЙ БЕЗНАДЗОРНОСТИ И БЕСПРИЗОРНОСТИ В ПОСЛЕВОЕННЫЕ ГОДЫ (1944–1953 гг.)

*На основании архивных материалов исследуются основные направления и достигнутые результаты деятельности специализированных органов и подразделений НКВД/МВД Беларуси в организации мер по ликвидации и профилактике детской безнадзорности и беспризорности. Одним из важнейших участков работы сотрудников милиции в данном направлении были выявление и анализ истоков и причин детской безнадзорности и беспризорности и организационные усилия органов НКВД/МВД по ее минимизации и искоренению в послевоенные годы.*

Порожденные войной сиротство, детские безнадзорность, беспризорность и преступность уже к 1942 г. приобрели в СССР значительные масштабы и стали представлять собой весьма опасное явление государственного значения. Война во все времена является одним из основных источников бедствий и страданий детей. За годы войны погибло, по минимальным подсчетам, около 2 млн советских детей. В целом по стране к 1945 г. насчитывалось более 1 млн детей-сирот [2, с. 8]. Количество осиротевших детей на территории, освобожденной от оккупации Беларуси, точному учету не поддается. Огромное количество детей лишились семьи и стали сиротами, потерялись в ходе эвакуации и бегства из западных областей, пострадали от оккупантов, попали в фашистские концлагеря. Это вызвало в стране массовую детскую беспризорность, безнадзорность и преступность. Перед государством встала задача вернуть к нормальной жизни детей, оставшихся без семьи и крова. На это направлялись усилия органов исполнительной власти – Советов, комсомольских органов, наркомата просвещения, профсоюзов и др.

Для преодоления и ликвидации любого социально опасного явления необходимо прежде всего иметь о нем полную информацию, проанализировать причины и истоки явления. Для оперативного поиска эффективных путей и средств ликвидации детской безнадзорности, беспризорности и преступности их истоки и причины должны были быть изучены и проанализированы. Эта задача в постановлении СНК СССР и ЦК ВКП(б) от 23 января 1942 г. «Об устройстве детей, оставшихся без родителей» возлагалась на органы внутренних дел. Им поручалась организация и координация всей работы по выявлению детей, оставшихся без родителей, и последующее их устройство в специальных учреждениях. Работа по учету детей-сирот, изучению и последующему анализу причин детской безнадзорности и беспризорности получила новый импульс в постановлении СНК СССР от 15 июня 1943 г. № 659 «Об усилении мер борьбы с детской беспризорностью, безнадзорностью и хулиганством», где было предусмотрено создание в НКВД СССР и союзных республик, краевых и областных управлениях НКВД специализированных подразделений – отделов и отделений по борьбе с детской беспризорностью, безнадзорностью и преступностью. В их компетенцию входила, что особо было подчеркнуто в приказах НКВД СССР от 21 июня 1943 г. и МВД СССР от 23 сентября 1948 г., задача обобщения всех данных и материалов по детской безнадзорности и беспризорности и организации изучения и учета задержанных детей [1, ф. 51. оп. 1. д. 14. л. 108–109].

Беспризорными и безнадзорными детьми занимались несколько подразделений НКВД/МВД. Первичной инстанцией, куда доставлялись задержанные различными службами милиции, являлись детские приемники-распределители НКВД. Первым, с кем сталкивался задержанный на вокзале, рынке, в магазине или другом общественном месте беспризорный ребенок или подросток, был со-